Варта адзначыць, што статусная няпэўнасць маладых робіць іх уразлівымі не толькі да, так бы мовіць, «прафесійнага» шкодаността ўздзеяння чараўніка. Паводле традыцыйных уяўленняў, сурочыць або зачараваць маладых можа хто заўгодна. Асаблівую цікавасць у гэтым плане выклікаюць тэксты, дзе галоўным суб'ектам чараўніцтва становіцца пакінутая хлопцам дзяўчына, асабліва тая, што нарадзіла ад яго дзіця. Відавочна, што парушэнне парадку жыццёвага сцэнару дзяўчыны (змена стану не санкцыянавана супольнасцю праз рытуальныя механізмы, нараджэнне дзіцяці адбылося раней за вяселле) абумоўлівае яе спецыфічны статус, які выходзіць за межы сацыякультурных нормаў. Адпаведна, як і ў выпадку іншых адхіленняў ад нормы (калецтва, жабрацтва і да т.п.), носьбіт такога статусу надзяляецца ў народнай свядомасці ўзмоцненымі магічнымі здольнасцямі: «…буваець так, што хлопец дружыў, дружыў з адный дзеўкай, а тую не ўзяў, узяў кінуў тую. А яна ад яго радзіла, а ён другую ўзяў. Гэта точна было. І вот гэта дзеўка праклінаець гэтага хлопца, як яна заклянець, так яму і астанецца. Праклянець: «Каб ты век жаніўся, сколькі будзеш жыць», значыт і будзець жаніцца. Праклянець: «Каб у цябе дзеці не гадаваліся», так і будзець. І гэта сушчая праўда» [4, с. 224]. Акцыянальны аспект падобнага чараўніцтва-помсты прадстаўлены ў асноўным дзеяннямі, накіраванымі на сімвалічнае "перакрэсліванне" дарогі маладым, што мае сваім вынікам разнастайныя нягоды ў іх будучым жыцці: «вот, напрымер, ен любіцца с адной, ну а жэніцца с другой. ... А ен тады як ужо вязець маладуху, яна тады ката за хвост цігаіць па дарозе, каб гаворыць, драліся ўсю жысць» [1]; або выкарыстаннем атрыбутаў з сімволікай смерці: «дзяўчынку зрабіў другой дзеўцы, а замуж не браў… Яна прынясла з магільніку, а яны вянчаюцца. А яна гэтай зямлёй… [Хлопец] ажаніўся, двое дзяцей было, паехаў… на возера і …разам з мальцам утапіліся» [5, с. 28].

Такім чынам, разгляд уяўленняў пра чараўніцтва і знахарства ва ўзаемасувязях з традыцыйным вясельным абрадам беларусаў Падзвіння дазваляе выявіць спецыфічныя аспекты бытавання і дапоўніць характарыстыку гэтых цікавейшых феноменаў народнай культуры.

**Спіс літаратуры:**

1. Запісана Мішынай В. І. і Мішыным П. І. ад Ханяк А.І., 1932 г.н, в. Макараўшчына, Лепельскага р-на, Віцебскай вобл, 2007 г.
2. Зямная дарога ў вырай: Беларускія народныя прыкметы і павер'і : Кн 3. / уклад., прадм., пер. і паказ. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 654 с.
3. Лобач, У. А. Вобраз чараўніка ў традыцыйнай карціне свету беларусаў Падзвіння ХХ – пач. XXI ст. (па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый ПДУ) / У. А. Лобач // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. II Міжнар. навук. канф., Полацк, 17-18 красав. 2014 г. : у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т ; пад аг. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, С. А. Шыдлоўскага. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – Ч. 1. – С. 213–219.
4. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння : У 2 ч. / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; склад. У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – Ч. 2. – 332 с.
5. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. ; склад., прадм. і паказ. У. А. Лобача / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2. – 368 с.
6. Романов, Е. Р. Белорусский сборник. В 9 вып. / Е. Р. Романов. – 1886-1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – Вильна, 1912. – 600 с.
7. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. В 3 т. / П. В. Шейн. – 1887-1902. – Т. 1. Ч. 2 : Бытовая и семейная жизнь белорусса в обрядах и песнях. – СПб., 1890. – 708 с.
8. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. В 3 т. / П. В. Шейн. – 1887-1902. – Т. 3 : Описание жилища, одежды, пищи, занятий; препровождение времени, игры, верования, обычное право; чародейство, колдовство, знахарство, лечение болезней, средства от напастей, поверья, суеверья, приметы и т. д. – СПб., 1902. – 535 с.

*Святлана Анэйка*

## АДЛЮСТРАВАННЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА КАЛЕНДАРА Ў АЙЧЫННЫМ ЖЫВАПІСЕ І ДАКУМЕНТАЛЬНЫМ КІНО

*Аўтар артыкула адсочвае, як старонкі беларускага народнага календара адлюстраваны ў творах жывапісу і ў фільмах неігравога кіно, як кінадакументалісты разам з этнолагамі і этнамузыколагамі ствараюць фільмы аўдыявізуальнай антрапалогіі, фіксуюць і захоўваць праз экран адметнасць народнага календара беларусаў.*

*Sviatlana Aneyka*

## REFLECTION OF THE BELARUSIAN FOLK CALENDAR IN THE NATIONAL PAINTING AND DOCUMENTARY FILMS

*Pages of Belarusian folk calendar reflected in the paintings and films of documentary films. Documentary filmmakers together with ethnologists and ethnomusicologists create movies in the sphere of audiovisual anthropology, fixed and stored with the help of the display the feature of Belarusian folk calendar.*

Багацце і разнастайнасць беларускага фальклору звязана з асноўным гаспадарчым заняткам нашых продкаў з неалітычных часоў – земляробствам. Аграрны тып традыцыйнай айчыннай культуры аказаў значны ўплыў на фарміраванне беларускага народнага календара. Змена сезонаў і адпаведных ім форм сельскагаспадарчай актыўнасці, чаргаванне сонцаваротаў і раўнадзенстваў як маркераў змянення прыродных біярытмаў знайшлі адлюстраванне ў каляндарнай абраднасці, якая ў асноўных сваіх праявах захавалася да нашых дзён.

Як зазначае філолаг А. Ю. Лозка, беларускі народны каляндар – адна з форм духоўнага жыцця нацыі, сістэма свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, ігрышчаў, пэўных дзён, забарон, што замацаваны ў побыце і фальклоры беларусаў, і з'яўляюцца арыенцірам пры выкананні сельскагаспадарчых работ і адпачынкаў у гадавым, сезонным, месяцавым цыклах [3,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

с. 15]. Увесь каляндарна-земляробчы цыкл падзяляецца на чатыры пары года, у кожнай з якіх сваё адмысловае кола святаў і абрадаў.

У беларускім дакументальным кіно тэма каляндарнай абраднасці з’яўляецца адной з вядучых. Дзякуючы плённай дзейнасці айчынных рэжысёраў-дакументалістаў сумесна з вядучымі этнамузыколагамі і фалькларыстамі ў 1970–1990 гг. на студыі «Летапіс» быў створаны ўнікальны цыкл фільмаў, прысвечаны музычнаму абрадаваму фальклору. Яго сцэнарыстам выступіла вядомы айчынны этнамузыколаг і аўдыявізуальны антраполаг З. Я. Мажэйка. Матэрыял, які лёг у аснову сцэнарыяў, быў адабраны ёю ў выніку шматгадовых экспедыцыйных даследаванняў песеннай культуры беларускіх рэгіёнаў: Палесся, Падняпроўя, Паазер’я, Панямоння, Цэнтральнай Беларусі. У цыкл увайшло 6 фільмаў: «Палескія калядкі» (1972 г.), «Галасы вякоў» (1979 г.), «Памяць стагоддзяў» (1982 г., тры – рэжысёр Н. Сава), «Палескія вяселлі» (1986 г., рэжысёр Ю. Лысятов), «Пранясі, Божа, хмару» (1990 г., рэжысёр В. Шклярэўскі), «Крывыя вечары» (1993 г., рэжысёр Ю. Лысятаў), «Рух зямлі» (1999 г., рэжысёры Ю. Лысятаў, С. Гайдук).



Малюнак 1 – Гуканне вясны ў Тонежы, кадр з антрапалагічнага фільма «Рух зямлі», 1999



Малюнак 2 – Нашчадак беларусаў-самаходаў з Сібіры спявак Міхась Басякоў, кадр з фільма «Рух зямлі», 1999

Апошні фільм асабліва востра ставіў праблемы этнаэкалогіі каляндарнага фальклору на прыкладзе традыцыі ўлюблёнай спеўнай вёскі З.Мажэйкі – Тонежа (мал. 1) і праблему пераемнасці мастацтва вуснай традыцыі беларусаў паміж пакаленнямі, праблему айчынных выканальніцкіх традыцыйных спеўных школ, якія трагічна гінуць у краіне пад акампанемент абыякавасці афіцыйнага мастацтва, але іх патэнцыял дае ім рух, магчымасць нечакана, але геніяльна праявіцца ў беларускіх дыяспарах (мал. 2). Гэтыя фільмы раскрываюць спецыфіку ашчадных адносінаў да ўнікальных старадаўніх народна-песенных абрадаў і звычаяў у беларускай вёсцы. Як адзначае кіназнаўца М. А. Белавокая, агульнымі прынцыпамі для ўсіх карцін з’яўляецца ўвасабленне максімальна дакладнага асяроддзя на экране, якое дазваляе зразумець і адчуць вытокі і асаблівасці аўтэнтычнага беларускага фальклору [5, с. 307].

На РУП «Беларускі відэацэнтр» на працягу 2003–2011 гг. быў створаны цыкл пад агульнай назвай «Беларускі народны каляндар». У ім прадстаўлены наступныя святы: Масленіца, Вялікдзень, Юр’еў дзень, Троіца, Радаўніца, Купалле, Зажынкі, Дажынкі, Дзяды, Тры каралі, Вадохрышча. Аўтарам ідэі і сцэнарыстам выступіла этнолаг Т. І. Кухаронак. У цесным супрацоўніцтве з ёю працавалі такія рэжысёры, як Р. Грыцкова, І. Волах, В. Каралёў. Кожны фільм здымалі ў тых беларускіх вёсках, дзе бытуюць згаданыя вышэй этнаграфічныя абрады. Да прыкладу, у фільме «Радаўніца» (2006 г., рэжысёры Р. Грыцкова і І. Волах) прымалі ўдзел жыхары вёсак Пласток, Ямінск, Кузьмічы і Юшкавічы Любанскага раёна [5, с. 263].

Цыклічнасць каляндарнага года падкрэслена ў дакументальным фільме «Кола часу» (Беларускі відэацэнтр, 2012 г., рэжысёр І. Бышнёў). Аўтарамі сцэнарыя выступілі рэжысёры-дакументалісты І. Бышнёў, Ю. Ігруша і этнолаг Р. Гамзовіч. Здымкі на працягу года праходзілі ў в. Пагост Жыткавіцкага раёна, дзе ў нязменным выглядзе захаваліся да нашага часу ўнікальныя абрады і рытуалы («Карагод», «Жаніцьба коміна»).

Структурна фільм «Кола часу» падзелены на 4 часткі, што адпавядае прыродным сезонам. У кожнай частцы рэпрэзентуецца абрад ці свята, якія характэрны для той ці іншай пары года (напрыклад, зіма ўключае Піліпаўку, Бедную куццю, Каляды; вясна складаецца з Масленіцы, Гукання вясны, Вербніцы, Юр’я).

Рэпрэзентацыя кожнага абраду і свята выяўляе найбольш важныя элементы рытуальных дзеянняў – выкананне традыцыйных песень, упрыгожванне печы, падкідванне фігурак з цеста на ручніку, збор зёлак і траў. Камера старанна фіксуе абрады і рытуалы, рухаючыся разам з удзельнікамі. У выніку фільм ператвараецца ў своеасаблівую кінааповесць, у якой адлюстравана святочная і абрадавая культура беларусаў у адзінстве з каляндарным годам.

Дакументальны экран дазваляе зафіксаваць унікальныя малавядомыя мясцовыя абрадавыя дзеянні. Фільм «Варвараўская свечка» («Беларускі відэацэнтр», 2012 г., режысёр В. Дашук) у экраннай форме адлюстроўвае адмысловае абрадавае дзеянне, якое існуе ў в. Басценавічы Мсціслаўскага раёна. Падчас абраду адбываецца перанос з адной хаты ў другую галоўнага атрыбута – свячы, створанай жанчынамі ўручную і упрыгожанай каляровымі стужкамі і кветкамі. Свечка ў свядомасці беларусаў успрымаецца як абаронца ад усялякіх хваробаў і няшчасцяў. Сам абрад здзяйсняецца ў дзень Святой пакутніцы Варвары і заклікае да захавання сямейных каштоўнасцяў.

Беларускія мастакі, таксама як кінадакументалісты актыўна звяртаюцца да беларускага народнага календара ў якасці крыніцы творчага натхнення. У адрозненне ад дакументальнага экрана, які перадае старонкі беларускага народнага календара ў дастаткова поўным аб’ёме, у жывапісе большая ўвага надаецца значным і шырока вядомым народным святам, такім як Каляды, Купалле, Вялікдзень. Магчыма, мастакоў прываблівае амысловы настрой, знешняя яскравасць і каларыстычная разнастайнасць гэтых значных у жыцці беларусаў святаў, іх сімвалічная напоўненнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асабліва шырока ў айчынным жывапісе прадстаўлена свята Купалле, звязанае з летнім сонцастаяннем. Адным з першых беларускіх мастакоў, хто звярнуўся да купальскай тэмы, быў Міхаіл Філіповіч. Ён тройчы ў сваёй творчасці адлюстроўваў купальскага свята. Спачатку зрабіў гэта ў маляўнічым эскізе «Скаканне праз вогнішча» (1921 г.), які, на жаль, не захаваўся; а потым у карцінах «На Купалле» (паміж 1921–1922 гг.) і «Купальская ноч» (1939 г.). Этнаграфічная дакладнасць і дасканаласць малюнка тлумачацца, паводле думкі мастацтвазнаўцы В. Ф. Шматава, апорай на даследаванні фалькларыста А. Кіркора [6, с. 27].

У другой палове XX стагодзя купальскую тэму прадоўжылі распрацоўваць мастакі Віктар Барабанцаў («Купалле») і Аляксандр Ксяндзоў («Сон у купальскую ноч», 1991 г.).

Сярод любімых святаў мастакоў – Каляды – старажытнае свята зімовага сонцастаяння. Яно па-мастацку адлюстравана ў шэрагу твораў, у якіх робіцца акцэнт на паказ галоўных святочных атрыбутаў Каляд: каляднай зоркі і маскі «казы» («Каляднікі ў Ракаве», 1991 г., Леанід Шчамялёў, «У калядную ноч. Заслаўе», 1982 г., Аляксей Марачкін), стылізаванай выявы казы («Каляды», 1990 г., Наталля Залозная), традыцыйнай варажбы («Гаданне. Калядкі», 2004 г., Святлана Каткова).

Некаторыя мастакі, напрыклад, Васіль Касцючэнка, ствараюць серыі карцін, прысвечаных народным святам. Так, трыпціх «Прадчуванне Вялікадня» (дзве – 2005 г., 2010 г.) з'яўляецца выказваннем майстра на тэму галоўнага хрысціянскага свята. Прастора карцін сціпла запоўнена яйкамі, галоўнымі святочнымі атрыбутамі. Каларыстычнае вырашэнне амаль пастэльнае, не яркае. Васіль Касцючэнка ўжывае кантрастныя колеры блакітны і чырвоны, але за кошт дамінуючага белага ўтвараюцца арганічныя колеравыя спалучэнні.

Сяргей Цімохаў адлюстроўваў старонкі беларускага народнага календара асацыятыўна, праз паказ сімвалічных рэчаў, жывёл і птушак, якія ў ім сустракаюцца. Многія народныя святы зноў і зноў узнікалі на палотнах мастака ці былі прадстаўлены ў дыптыхах і трыпціхах карцін. Як зазначае мастацтвазнаўца А. Белявец, кожны твор мастака – рэч, замкнёная ў сабе: з прадуманымі метафарычнымі падтэкстамі, з нетаропкім другім планам, з не адразу заўважнымі «графічнымі» сакрэтамі [1, с. 15]. Сярод работ С. Цімохава можна ўзгадаць: «Каляды» (1993 г.), «Гуканне вясны» (1997 г.), «На Вялікдзень сонца грае» (2001 г.), «Цені Купальскае ночы» (2002 г.), «Золак Купальскае ночы» (дыптых, 2002 г.), «На Дзеды» (дыптых, 2004 г.), «Каляды» (дыптых, 2006 г.), «Спас» (трыпціх, 2008 г.), «Гуканне вясны» (2009 г.).

Творы мастака Уладзіміра Кожуха на каляндарна-абрадавую тэматыку вырашаны ў лірычным ключы. Майстар разглядае беларускія народныя святы, перш за ўсё як частку хрысціянскага календара. Жывапісныя творы «На Троіцу» (1991 г.), «На Вялікдзень» (2013 г.), «На Каляды» ўтвараюць цыкл «Хрысціянскія святы», які ўражвае непаўторнасцю і ўнутраным спакоем. Кожнаму твору адпавядае свой колер: чырвоны – Вялікдзень, чорны з белым – Троіца. Лакальныя колеры і вытанчаныя выцягнутыя, як свечка, сілуэты персанажаў падкрэсліваюць сувязь творчасці У. Кожуха з праваслаўным іканапісным канонам.

Рамантычна-фантастычная трактоўка каляндарна-абрадавых свят належыць мастаку Алене Шлегель. Яна звярнула ўвагу на комплекс русальных абрадаў і рытуалаў, якія распачыналіся пасля Сёмухі (на пяцідзясяты дзень пасля Вялікадня) і працягваліся 7 дзён. Як адзначаюць даследчыкі Т. В. Валодзіна і Т. І. Кухаронак, русальны тыдзень беларусы вельмі шанавалі, не пачыналі ніякай новай работы, не пралі, не ткалі [2, с. 241]. Галоўныя абрадавыя дзеі ў гэтыя дні былі звязаны з міфалагічнымі істотамі – Русалкамі, якія па павер'ях беларусаў у гэты час знаходзіліся на зямлі і былі небяспечныя для чалавека (заманьвалі і тапілі людзей). Адсюль вялікая кольскасць дзеянняў ахоўнага характару (не хадзіць у лес, да возера ці ракі, каб не забралі русалкі) і магічных рытуалаў, якія выконвалі маладыя дзяўчаты (пераапраналіся ў русалак, плялі вянкі, стваралі рытуальнае шэсце, спявалі песні, хадзілі ў жыта) [4, с. 145]. Абрадам провады Русалкі тыдзень завяршаўся і дэманічныя істоты пакідалі «белы свет».

Цыкл Алены Шлегель «Русальны тыдзень» (2014 г.) складаецца з 7 карцін – на кожны дзень тыдня. Такая кампазіцыйная пабудова дазволіла А. Шлегель падзённа паказаць абрадавыя дзеянні. Але падыход матачкі не прадугледжвае дакладнай этнаграфічнай перадачы календарнага абраду. А. Шлегель запаўняе прастору палотнаў прыгожымі жаночымі тварамі, кветкамі і раслінамі, рыбамі, месяцам і зоркамі. Жаночыя вобразы сімвалізуюць і таямнічых Русалак, і дзяўчын, якія здзяйснялі неабходныя рытуальныя дзеі на працягу тыдня. Рознакаляровыя рыбы і кветкі, вытанчаныя бярозкі і лісце папараці выяўляюць водную і зямную стыхіі, у якіх існуюць Русалкі.

Такім чынам, беларускі народны каляндар з'яўляецца прадметам мастацкай рэфлексіі кінадакументалістаў і мастакоў-жывапісцаў. Дакументальны экран дэманструе глыбокі этнаграфічны падыход да паказу каляндарна-абрадавых дзеянняў. Для гэтага ў якасці сцэнарыстаў і кансультантаў запрашаюцца этнолагі, этнамузыколагі, фалькларысты. Абрады і святы беларускага народнага календара на экране з'яўляюцца вынікам іх непасрэднай фіксацыі этнаграфічных ці аўтэнтычных выканаўцаў і пераемнікаў народных традыцый. Намаганні стваральнікаў фільмаў вядуць да сцвярджэння дакументальнай дакладнасці ў перадачы абрадаў і святаў. Жывапісныя палотны, заснаваныя на сюжэтах беларускага народнага календара, – вынік асацыятыўнага ўспрымання мастакамі абрадаў і святаў. У іх перадачы прасочваюцца розных падыходы да выкарыстання этнаграфічнага матэрыялу: ад «дакументальнай» дакладнасці (карціны М. Філіповіча, Л. Шчамялёва, А. Марачкіна) да метафарычнасці і сімвалічнасці выказвання (В. Барабанцаў, В. Касцючэнка, С. Цімохаў, У. Кожух, А. Шлегель).

**Спіс літаратуры:**


1. Белявец, А. Форма і дух : выстава Сержука Цімохава / А. Белявец // Мастацтва. – 2013. – № 12. – С. 14–15.
2. Валодзіна, Т. В. Ядраное жыта гаспадар кліча : каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 356 с.
3. Лозка, А. Ю. Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1993. – 205 с.
4. Сысоў, У. М. З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1997. – 415 с.
5. Экран и культурное наследие Беларуси / А. А. Карпилова [и др.] ; вступ. ст. П. П. Латушко ; редкол. : А. И. Локотко, А. В. Красинский, А. А. Карпилова / НАН Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 383 с.
6. Шматаў, В. Ф. Міхась Філіповіч / В. Ф. Шматаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 99 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ